Показательным для ИГР является преимущественное внимание Карамзина к человеку как историческому лицу. Использование сравнений для раскрытия культурологической тематики в тексте занимает не столь важное место. Почти не попадают в поле зрения писателя явления живой и неживой природы. Но в выборе сферы образного сравнения Карамзин ориентируется в основном на мир человеческих поступков, характеров, качеств, которые закрепились в языке определенными лексиконами. Сравните: "Мужественный Владимир Глебович встретил половцев под стенами и бился, как герой", "Святослав же не хотел ехать к хану, укрываясь в темноте лесов как злодей", "Великий Князь вошел в столицу, славимый, ласкаемый народом, как отец детьми". Как видим, в "Истории" сравнения сфокусированы на характеристике поступков, действий конкретных исторических лиц, наглядности описываемых событий и явлений.

**Г.П. Твapaновіч**, ст. навуковы супрацоўнік
Інстытута літаратуры НАН Беларусі

## КІРЫЛА-МЯФОДЗІЕЎСКАЯ ТРАДЫЦЫЯ І СЛАВЯНСКІ КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНЫ ТЫП

У сучасным свеце адбываюцца парадаксальныя працэсы. Так званаму навукова-тэхнічнаму прагрэсу прама прапарцыянальны рэгрэс духоўных каштоўнасцей. Чым вышэйшыя дасягненні чалавека ў розных практычных сферах, тым ніжэйшы ўзровень яго духоўных патрэб, адчуванняў. Культура, відавочна, набывае забаўляльны характар, становіцца індустрыяй пацехі. У дадатак да шэрага праблем фізічнага выжывання чалавецтва апынулася перад пагрозай страты асабовасці, перад уніфікацыяй аблічча цэлых народаў. У якой ступені датычыцца гэта славян? Наколькі праяўлены славянскі тып культурнага фарміравання? Ці ў сілах ён разумна супрацьстаяць тэхнагеннаму наступу сучаснай цывілізацыі?

Арэал еўрапейскай аседласці славян – усходніх, заходніх, паўднёвых – сведчыць пра тое, што нашыя агульныя продкі былі шматлюдным, дынамічным народам. Гістарычны лёс славянства разгортваецца з унікальнай паслядоўнасцю: найчасцей "з агня ды ў полымя", без віны вінаватыя, ці, па словах сербскага акадэміка П.Палавэстры, "зло цярпі з-за боязі горшага". Яскрава выяўляецца ў гэтым поступе праз суцэльныя іспыты вернасць высокім ідэалам хрысціянства. Адпаведнасць яго славянскаму характару знайшла адбітак у цеснай зпітаванасці гісторыі і культуры. Згадаем, напрыклад, спарадзіўшую шматвяковы фальклор і багатую

літаратуру Косаўскую галгофу сербаў 1389 г. Змаганне тут ішло за "крыж святы", сімвал царства Хрыстова. Вялікі ліцвін-наваградзец Адам Міцкевіч падкрэсліваў у сваіх парыжскіх лекцыях аб славянскіх літаратурах: "Нідзе яшчэ ідэя хрысціянства, якая вызначыла новы этап у паэзіі і новае яе прызначэнне, не была выяўлена так ясна і выразна... Ідэя поўнага самаадрачэння належыць славянскаму эпасу, які ўяўляе сабою не што іншае, як гісторыю вялікіх няшчасцяў, вялікіх бядот. Святочнасць, па вызначэнні гэтых паэтаў, магчымая толькі на нябёсах, на зямлі ж яны шукаюць толькі славы для сваіх герояў. Новая ж паэзія паганскіх народаў неаднаразова апявала і ўзвышала сілу. Гэтым культам пераможнай сілы завяршаецца іхняя гісторыя, як у свой час гэтым жа культам адкрывалася гісторыя старажытных народаў"[1]. Сапраўды, у галоўнай сваёй сутнасці сербскі эпас паслядоўна выяўляў прыналежнасць да ідэалаў новазапаветнай цывілізацыі, новага летазлічэння, грамадзянін якога адказвае не толькі за свае благія, злачынныя ўчынкі, але і заклікаты да самаўдасканалення, высокай ахвярнасці, чысціні памкненняў, намераў, калі нават яны не заўсёды знаходзяць увасабленне ў канкрэтныцы жыццёвых сітуацый. Сербскі князь Лазар перад зямнымі дабротамі аддае перавагу смерці і царству Нябеснаму з яго вечнымі каштоўнасцямі. У асобе князя Лазара мы сутыкаемся з ужо выразна праяўленым этнічным архетыпам-квінтэсенцыяй глыбіннай сутнасці народа, якая арганізуе знутры падзейную канву гістарычнага часу. Ахвярнаму здзяйсненню на Косавым полі папярэднічала эпоха Няманічаў-цароў, якія былі іерэямі, асветнікамі, манахамі. Яны ўзвялі на сербскай зямлі 45 цэркваў і манастыроў, што выразна сведчыла аб інтэнсіўным духоўным росце, умацаванні народа ў пэўнай хрысціянскай традыцыі.

На адно чалавечае пакаленне раней за Няманічавага сына Растка – сербскага святіцеля Саву – заманашыла ў Полацку юная князёўна Прадслава, наша святая апякунка Ефрасіння. У X–XI стст. Полаччына ўжо без пасрэдніцтва Кіева наладжвала ажыўленыя сувязі з Візантыяй. Пра непасрэдны візантыйскі ўплыў яскрава сведчыць уся гісторыя сярэднявечнага мастацтва і культуры Полацка: храмы, фрэскі, славуты напрастольны крыж, зроблены Лазарам Богшам...

Славянскі культурна-гістарычны тып як своеасаблівая культура з унікальнымі мастацкімі, рэлігійнымі, сацыяльна-эканамічнымі

---

[1] Мицкевич А. Собр. соч.: В 5 т. – М., 1954. – Т.4. – С. 188.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асаблівасцямі, сама дзяржаўнасць славян фарміраваліся ў перыяд дамінацыі ў Еўропе дзвюх асноўных сіл – Візантыі і Рымскай імперыі. Аб лёсаноснай ролі традыцыі Рыма або Візантыі асабліва выразна сведчыць духоўны, культурны шлях паўднёвых славян. Практычна аднародныя некалі плямёны сербаў, харватаў, славенцаў, аказаўшыся ў сферы ўплыву розных хрысціянскіх канфесій, сфарміравалі своеасаблівыя культуры, набылі адметны псіхалагічны склад. Дзякуючы роўнаапостальным братам Кірылу і Мяфодзію славяне на пяць стагоддзяў раней за народы Заходняй Еўропы атрымалі на сваёй мове Святое Пісанне, а менавіта пераклад Біблії на нацыянальныя мовы – адзін з істотных крытэрыяў эпохі Адраджэння.

Славянскі тып культурна-гістарычнага фарміравання найбольш яскрава, на нашу думку, выяўляецца ў трыадзінстве працэсаў: 1) этнічны шлях; 2) яго выразная народная "архетыпізацыя" ў выглядзе ідэалізаваных гістарычных асоб і 3) адлюстраванне гэтага самаруху нацыянальнага жыцця ў прафесійным мастацтве. Асабліва важнае і найменш вывучанае, мабыць, прамежкавае звяно. Аб з'яве ідэалізацыі гістарычных дзеючых асоб на ўзор нацыянальна-стэрэатыпных паводзін пісаў у свой час вядомы гісторык В.В.Ключэўскі: "Ёсць імёны, якія насілі гістарычныя людзі, што жылі ў вядомы час, рабілі гістарычна вядомую жыццёвую справу, але імёны, якія ўжо страцілі храналагічнае значэнне, выступілі па-за межы часу, калі жылі іхнія носьбіты. Гэта таму, што справа, здзейсненая такім чалавекам, па сваім значэнні гэтак далёка выходзіла за абсягі свайго веку, сваім дабратворным дзеяннем гэтак глыбока захапіла жыццё далейшых пакаленняў, што з асобы гэтага дзейсніка ў свядомасці гэтых пакаленняў пастунова спадала ўсё часовае і мясцовае, яна з ідэі гістарычнага дзеяча ператваралася ў народную ідэю, а сама справа яго з гістарычнага факта рабілася практычнай запаведдзю, запаветам, тым, што мы прывыклі называць ідэалам"[2].

Такія людзі бачацца гісторыку не проста вялікімі нябожчыкамі, а вечыстымі спадарожнікамі наступнікаў, нават праваднікамі, і цэлыя стагоддзі ўспамінаюць іхнія дарагія імёны не столькі дзеля таго, каб удзячна ўшанаваць іх памяць, колькі для таго, каб самім не забыць правіла, імі запаведанага.

[2] Ключевский В. О. Афоризмы. Исторические портреты и этюды. Дневники. – М., 1993. – С. 94.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Самаахвярнае падзвіжніцтва салунскіх братоў сталася адной з важнейшых тэм літаратуры стараславянскай эпохі. Пры гэтым выкарыстоўваліся тры асноўныя тагачасныя жанры – жыціе, пахвальнае слова і служба. Аднак імёны Кірыла і Мяфодзія сапраўды выступілі за межы адведзенага ім зямнога часу. Здзейсненае імі значна паўплывала на параметры духоўна-культурнага развіцця славянства, зрабілася практычным запаветам-ідэалам. Жыццяздольнасць славянскага культурна-гістарычнага тыпу трымаецца на надзейным падмурку, закладзеным роўнаапостальнымі Кірылам і Мяфодзіем. І найперш менавіта ўсведамленне кожным народам свайго духоўнага патэнцыялу, культурна-гістарычнай глебы садзейнічае супрацьстаянню татальнай уніфікацыі, наступу масавай культуры і ўрэшце суперцывілізаванаму на гэты раз змяшэнню "языкаў".

**А.В.Морозов**, докторант Института
искусствоведения, этнографии и
фольклора НАН Беларуси

## СУЩНОСТНЫЕ ХАРАКТЕРИСТИКИ ДУХОВНЫХ СТИХОВ ВОСТОЧНЫХ СЛАВЯН В СВЕТЕ ИСТОРИОГРАФИИ РУССКОЙ ФОЛЬКЛОРИСТИКИ

Анализ историографического материала, накопленного за полтора столетия изучения духовных стихов, обнаруживает исследовательские “приоритеты” представителей различных школ и направлений.

Мифологической школой второй половины XIX ст. (А.Афанасьев, Ф.Буслаев и др.) наибольшее внимание уделялось выявлению в стихотворных текстах остатков дохристианских представлений.

Представителей культурно-исторического направления прежде всего интересовали конкретные канонические и неканонические источники, а также возникающие на их основе стихотворные сюжеты. Важность исследования произведений народной словесности подчеркивалась необходимостью рассмотрения взаимодействия литературной и фольклорной традиций. Данный подход наиболее ярко был реализован А.Веселовским в его “Разысканиях в области русского духовного стиха” (СПб., 1879 – 1891. – Вып. 6).

Этнографические задачи изучения духовных стихов нашли выражение в публикациях конца XIX – начала XX стст. и, прежде всего, в четырех сборниках “Материалов к истории изучения русского

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ